Весці БДПУ. Серыя 2. 2018. № 2. С. 44–49

УДК 94(476)"15/16":37

# АДУКАЦЫЙНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ АНТЫТРЫНІТАРЫЯЎ У БЕЛАРУСІ Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XVI – ПЕРШАЙ ПАЛОВЕ XVII ст.

**А. Ф. Самусік,**
*кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры эканамічнай гісторыі БДЭУ*

Паступіў у рэдакцыю 08.11.18.

UDC 94(476)"15/16":37

# EDUCATIONAL ACTIVITY OF ANTITRINITARIANS IN BELARUS IN THE SECOND HALF OF THE XVI – THE FIRST HALF OF THE XVII CENTURY

**A. Samusik,**
*PhD in History, Associate Professor of the Department of Economic History, BDEU*

Received on 08.11.18.

Артыкул прысвечаны нераспрацаванай у гістарыяграфіі праблеме асветніцкай дзейнасці антытрынітарыяў на беларускіх землях у другой палове XVI – сярэдзіне XVII ст. Вызначана спецыфіка арганізацыі ў школах дадзенай плыні пратэстантызму вучэбна-выхаваўчага працэсу. Адзначаны найбольш вядомыя фундатары з ліку айчыннай правячай эліты і школы антытрынітарыяў, што знаходзіліся пад іх апекай. Асобная ўвага аўтара была скіравана на вучэбна-метадычным забеспячэнні гэтых навучальных устаноў з аналізам зместу асобных падручнікаў. Паказана стаўленне антытрынітарыяў да жаночай адукацыі. Разгледжана гісторыя іх выгнання з Рэчы Паспалітай.

*Ключавыя словы:* адукацыя, Рэфармацыя, антытрынітарыі, школы, падручнікі, грамадзянскае выхаванне.

The article is devoted to the problem which is not developed well in historiography – the educational activity of antitrinitarians in the territory of Belarus in the second half of the XVI – mid XVII century. The specificity of school organization of the given trend of Protestantism in the educational process is defined. The most well-known funders from the number of the domestic ruling elite and antitrinitarian schools under their trusteeship are enumerated. Special attention of the author is paid to the educational-methodic supply of these educational institutions with the analysis of the contents of separate schoolbooks. The paper shows the attitude of antitrinitarians to female education. It considers the history of their proscription from Rzech Pospolita.

*Keywords:* education, Reformation, antitrinitarian, school, schoolbooks, civic education.

*Уводзіны.* Асобным напрамкам у рэфарматарскім руху Польшчы і ВКЛ быў антытрынітарызм, які часам называўся арыянства. У 1562 г. прыхільнікі гэтай канфесіі ў Рэчы Паспалітай адасобіліся ад кальвінізму і пачалі актыўна ствараць уласныя суполкі, у тым ліку і на тэрыторыі Беларусі. Прычыны хуткага пашырэння антытрынітарызму ў айчынным грамадстве вылучыў англійскі даследчык Ч. Бэрд: «Поток смелого рационализма… прорвался с юга. Сервет (*М. Сервет за свае тэалагічныя погляды быў спалены па загадзе Ж. Кальвіна ў Жэневе ў 1553 г. – А. С.*) был испанцем… Окино (*Б. Акіно на мяжы 1550–1560 гг. прапаведваў у Польшчы – А. С.*) и Социн (*Ф. Соцын з 1579–1604 г. жыў у Кракаве і яго наваколлі – А. С.*) родились в Сиене… Начиная с 1530 года мы всюду в Швейцарии и Германии наталкиваемся на беглецов с юга, которые ищут и нигде не находят убежища… Беглецы обратили свои взоры на Польшу, которая тогда по многим причинам сделалась общим приютом вольнодумцев… Шляхетская молодежь получала прекрасное по тому времени воспитание в иностранных, преимущественно немецких, университетах; она восприняла дух гуманистов и стала вполне на сторону реформации… Она встречала радушно итальянских выходцев, как людей науки и глубокого образования, давала им приют, в котором отказывали вольные города Германии и Швейцарии…» [1, с. 259–261].

У сферы асветы антытрынітарыі дзейнічалі цалкам асобна – яны канкуравалі не толькі з каталікамі, але і з тымі ж кальвіністамі і лютаранамі. Дарэвалюцыйны рускі даследчык К. Харламповіч адзначаў, што антытрынітарыі: «Заботились о просвещении своих единоверцев не менее, если не более чем кальвинисты; из их 150 общин редкая не имела своей школы и редкая не была руководима образованнейшими пасторами, прошедшими заграничные университеты… Их училища по числу студентов равнялись иезуитским, а Раковская их ака-

демия (*каля Сандаміра ў Польшчы, 1602–1638 гг. – А. С.*) превосходила даже виленскую, насчитывая у себя до тысячи учащихся… Кальвинисты потеряли много своих школ, которые делались социанскими с переходом к антитринитариям их основателей или патронов…». Таксама ён дадаваў, што, дзякуючы атрыманай тут адукацыі, іх выхаванцы: «приводили в восторг профессоров немецких университетов обширными познаниями и диалектическим развитием» [2, с. 162–163].

Аднак, нягледзячы на актыўную адукацыйную дзейнасць антытрынітарыяў, у айчыннай і замежнай гістарыяграфіі яна так і не стала прадметам асобнага навуковага аналізу. Яе вывучэнне адбывалася, пераважна, у рамках абагульняючых прац па гісторыі Рэфармацыі ў Рэчы Паспалітай з узгадваннем некаторых з належачых ім школ (акадэміі ў Ракаве і Іўі), а таксама адметных асветнікаў (у дачыненні да Беларусі – С. Будны, В. Цяпінскі і Я. Л. Намыслоўскі) [3, с. 83–96].

*Асноўная частка.* На тэрыторыі ВКЛ найбольш аўтарытэтным прыхільнікам гэтай плыні пратэстантызму быў кн. М. Радзвіл Чорны, які вырашыў адыйсці ад кальвінізму ў пачатку 1560-х гг. пад уплывам вядомага італьянскага тэолага Д. Бляндраты, які ў 1558 г. з-за пераследу кальвіністаў пераехаў у Рэч Паспалітую. На канцлера таксама моцна ўздзейнічаў і той факт, што да гэтай плыні далучыліся рэлігійныя і асветніцкія дзеячы, якім ён раней аказваў уласную пратэкцыю і лічыўся з іх меркаваннямі (С. Будны, В. Цяпінскі, Л. Крышкоўскі, І. Чаховіч). М. Радзвіл Чорны актыўна ўзяўся за справу злучэння суполак антытрынітарыяў у адзіную структуру, абараняў іх перад ідэолагамі пратэстантаў (палемізаваў нават з Ж. Кальвінам), а ў 1564 г. пачаў на ўласных землях замяняць нязгодных з імі прапаведнікаў. У тыя ж часы ў яго з'явіўся намер адпаведным чынам рэарганізаваць Віленскую кальвінскую школу, паставіўшы на яе чале Г. Бляндрату. Толькі смерць канцлера ў 1565 г. не дазволіла яму рэалізаваць уласныя планы [4, с. 113–116]. З пачатку 1560-х гг. да антытрынітарыяў перайшоў і падканцлер ВКЛ А. Валовіч, які прафінансаваў шэраг выданняў С. Буднага і дапамагаў В. Цяпінскаму [5, с. 115]. Аднак галоўным апекуном іх у ВКЛ стаў жмудскі староста Я. Кішка, якога кн. Радзівіл Чорны у 1563 г. асабіста накіраваў на вучобу ў Базель і Цюрых [6, с. 55].

Падтрымка магнатаў і шляхты дазволіла антытрынітарыям заснаваць на тэрыторыі Беларусі шэраг уласных школ – у Клецку, Койданаве, Любчы, Лоску, Нясвіжы і Навагрудку. Асобнае месца сярод іх займала арыянская акадэмія ў Іўі, заснаваная ў 1570-я гг. Я. Кішкай. Яе рэктарам у 1585–1593 гг. быў Я. Л. Намыслоўскі. Ён перапрацаваў вучэбную праграму акадэміі, уключыўшы ў яе склад: старажытныя і сучасныя мовы, творы антычных аўтараў, логіку, этыку, права і арыфметыку. Высокі ўзровень адукацыі прыцягваў сюды выхаванцаў рознага веравызнання. Так, нягледзячы на канфлікт арыян з кальвіністамі, у Іўе адправіў сваіх сыноў Ф. Еўлашоўскі. На жаль, пасля смерці фундатара (1592) дадзеная навучальная ўстанова прыйшла ў заняпад і была зачынена ў канцы XVI ст. [7, с. 41].

Пад час арганізацыі адукацыйнай справы ў антытрынітарыяў школы кіраваліся Сінодамі, што не толькі прызначалі ў іх рэктараў і настаўнікаў, але і абіралі падручнікі, па якіх трэба было весці заняткі. Рэктар, пры гэтым, пераважна выконваў абавязкі настаўніка старшага класа, а дапамагаў яму спецыяльны экзаменатар, які сачыў за вучэбнай часткай. Адметнасцю антытрынітарскіх школ было тое, што настаўніцтва ў іх было часовай працай – адной са ступеняў кар'ернай лесвіцы, што вяла да больш прыбытковых пасад прапаведніка ці міністра (святара) [8, с. 367–368].

Антытрынітарыі знаходзіліся ў вострай канфрантацыі з іншымі канфесіямі і былі вымушаны істотна пашыраць вучэбныя курсы ўласных школ з мэтай пошуку падтрымкі з боку тутэйшага грамадства. Жадаючы пераўзыйсці канкурэнтаў, яны, пакідаючы за тэалогіяй вядучае месца, уключалі ў праграмы карысныя для паўсядзённага жыцця прадметы – сучасныя мовы (польскую і нямецкую), матэматыку, геаграфію, палітыку, права, логіку і свецкую гісторыю. Пад уплывам гуманістычных ідэй у вучэбны курс было ўведзена і вывучэнне розных рамёстваў (вучні з шляхты наведвалі гэтыя заняткі па жаданні) [9, с. 48].

Адметнасцю выкарыстання антытрынітарыямі вучэбна-метадычнай літаратуры было тое, што па прычыне пераходу да іх цэлага шэрагу значных асветнікаў з іншых плыняў пратэстантызму працы апошніх (С. Будны, П. Статорый і інш.) дапускаліся да ўжытку ў іх школах. Так, асновы веравучэння доўгі час праходзілі па рукапісных спісах з Нясвіжскага катэхізіса 1562 г., перапрацаванага з улікам адметнасцей вераспавядання антытрынітарыяў. Толькі ў 1605 г. у Ракаве завяршылася шматгадовая праца цэлага шэрагу аўтараў (Ф. Соцын, П. Статорый, В. Шмальц і І. Машкароўскі) над Вялікім катэхізісам. Прычым адначасова з ім выйшаў і Малы катэхізіс для дзяцей (на польскай і нямецкай мовах). Яго ж польска-лацінская версія ўбачыла свет у 1612 г. [10, с. 105–106]

Пасля вывучэння катэхізіса вучэбная праграма антытрынітарыяў прадугледжвала два

далейшыя напрамкі вывучэння рэлігійных дысцыплін. Па-першае, выхаванцы праходзілі дагматычнае багаслоўе па творах Я. Фелькеля «Аб сапраўднай рэлігіі пяць кніг» (1595) на латыні і Х. Астародта «Навучанне галоўным аспектам хрысціянскай рэлігіі» (1612) на нямецкай мове. Па-другое, асобныя заняткі ішлі па хрысціянскай маралі. Яны распачыналіся са знаёмства з «Этыкай» Арыстоцеля, а таксама асобнымі ўрыўкамі з прац Сенэкі, Піфагора, Гарацыя, Цыцэрона, Платона і інш., якія папярэднічалі вывучэнню маралізатарскіх пастулатаў са Св. Пісання. Падобная практыка распачынаць знаёмства з нейкім прадметам, звяртаючыся да Антычнасці, дзейнічала і пры выкладанні права, дзе перад вывучэннем айчыннага заканадаўства вучнёўская моладзь праходзіла 4-томныя «Інстытуцыі» (з асновамі юрыспрудэнцыі) з Corpus iuris civilis – звода рымскага грамадзянскага права, складзенага па загадзе выізантыйскага імператара Юстыніяна ў 529–534 гг. (пашыраны ў Еўропе з часоў Сярэднявечча) [11, с. 179, 181–182].

Вывучэнне азначаных прац патрабавала дасканалага валодання латынню, для засваення якой была абрана граматыка галандскага навукоўцы К. Валерыя (Ультраэктына) з Утрэхта, які ў 1560–1570-я гг. быў прафесарам латыні ў Лёвене. Яна неаднаразова выдавалася ў XVI ст. у Кракаве, а ў Ракаве асобнае выданне гэтага падручніка ўбачыла свет у 1604 г. [12, с. 168].

Выкладанне дакладных дысцыплін антытрынітарыі забяспечылі ўласным вучэбна-метадычным дапаможнікам – у 1630 г. у Ракаве выйшлі лацінамоўныя «Практыкаванні матэматычныя» рэктара мясцовай акадэміі І. Стэгмана, першая частка якіх была прысвечана арыфметыцы (упершыню ў Рэчы Паспалітай разглядаліся дзесятковыя дробі і лагарыфмы), а другая – геаметрыі (да трыганаметрыі і стэрэаметрыі ўключна) з больш чым 200 гравюрнымі выявамі геаметрычных фігур і інструментаў (лінейкі, цыркулі, адвесы, трохвугольнікі, квандрант, пантограф і інш.) [13, т. 1, с. 43–52, 60–63; т. 2, с. 7, 24, 57, 69, 101].

Асобна неабходна спыніцца на дыдактычнай дзейнасці ужо згаданага Я. Л. Намыслоўскага – выхаванца Кракаўскага ўніверсітэта, які пераехаў з роднай Сілезіі ў Беларусь з мэтай пашырэння тут ідэй антытрынітарызму. Стаўшы рэктарам акадэміі ў Іўі, ён прыклаў значныя намаганні па забеспячэнні вучэбна-выхаваўчага працэсу ў ёй якаснымі падручнікамі. У 1586 г. ім быў выдадзены ў Лоску «Дапаможнік па навуках Арыстоцелевых для хрысціянскіх школ з багаслоўскімі прыкладамі». Гэта праца, фактычна кіраўніцтва па логіцы, была скіравана на пашырэнне кругагляду выхаванцаў і падрыхтоўку іх да дыспутаў з іншаверцамі: «Прыклады ў творы падабраны такім чынам, што такія падставовыя праўды артадаксальнай навукі, як Тройца, агульнасць Айца і Сына, боскасць Хрыста, хрышчэнне дзяцей і іншыя, выглядалі б зборам пярэчанняў і няпраўд у святле арыстоцелеўскай логікі» [14, с. 178–179]. У Лоску ў 1589 г. Я. Л. Намыслоўскі надрукаваў яшчэ адзін уласны падручнік – «Сентэнцыі для агульнага карыстання ў жыцці». Змешчаныя тут 225 маралізатарскіх вершаваных выслоўяў, на думку аўтара, павінны былі прывіць вучнёўскай моладзі этыка-дабрачынныя стэрэатыпы паводзін у грамадстве, а таксама спрыяць пашырэнню цікавасці юнакоў да антычнай літаратуры, гісторыі і філасофіі (частка з іх была напісана ім самім, а іншыя запазычаны з розных крыніц) [15, с. 41–45]. Адметным было і тое, што сентэнцыі даваліся ў кнізе на лацінскай, нямецкай і польскай мовах. Гэта дазваляла настаўнікам выкарыстоўваць іх у якасці прыкладаў пры замацаванні граматычных правілаў і такім чынам аблягчаць працэс запамінання. Менавіта дадзены аспект падручніка Я. Л. Намыслоўскага адзначыў С. Будны, які напісаў для яе прадмову-панегірык, дзе не толькі даў станоўчую адзнаку намаганням аўтара, але і звярнуўся да грамадства з заклікам вывучаць мовы, каб чытаць кнігі ў арыгінале і не залежаць ад суб'ектывізму перакладчыкаў [16, с. 57].

Важным элементам навучання ў антытрынітарыяў з'яўлялася і належнае выхаванне. Як і ў іншых плынях пратэстантызму, яно мела ў іх грамадзянска-патрыятычную арыентацыю. Лепшым прыкладам гэтага з'яўляецца асветніцкая дзейнасць В. Цяпінскага, які адзін з першых выступіў супраць апалячвання суайчыннікаў. Ён змагаўся за захаванне нацыянальнай самасвядомасці і народнай культуры, адстойваў годнасць беларускай мовы і асуджаў тых, хто аддаваў перавагу лацінскай ці польскай мовам. Яго прадмова да «Евангелля», выдадзенага ў 1570-я гг. у радавым маёнтку Цяпін на Віцебшчыне, насычана патрыятычным пафасам. Аўтар піша, што ўзяўся за выдавецкую справу з прычыны: «…зычливости ку моеи Отчизне». Ён са шкадаваннем адзначаў недастатковае развіццё айчыннай культуры: «Хто б не мусил плакати, видечи так великих княжат, таких панов значных, так много деток невинных, мужов з жонами в тако зацном руском, а звлаща перед тым довстипном учоном народе, езыка своего славнаго занедбане… Што может бытии жалоснейшая, што шкарадша, иж тые, што се межи ними зовуть духовными и учители, смелее мовлю, намней его не вмеють, намней его вырозуменя не знають, а ни се

в нем не цвичат, але и ани школы ку науце его нигде не мають, зачим полские або в иные писма за такою неволею, немало и у себе, и дети не без встыду своего, бы се одно почули, немалого заправують». В. Цяпінскі прыводзіў прыклад розных еўрапейскіх народаў (італьянцаў, палякаў, французаў, англічан, іспанцаў), якія: «Слово Боже з латинских и иных писмь своим теж езыком прирожоным перекладати и читати почали». У канцы прадмовы ён абвінавачваў духавенства і настаўнікаў у адсутнасці патрыятызму, заклікаў іх узгадняць свае дзеянні з «патрэбаю Айчыны» і быць гатовым: «Если она до конца згинет, з нею згинуть; або, если, через вашь ретунек будет выдвигнета, з вами и з нею выбринуть» [17, с. 33–36].

З мэтай выхавання ў вернікаў пачуцця грамадзянскай адказнасці выдаваліся антытрынітарыямі адметныя працы адпаведнага зместу. Традыцыйным тут быў зварот да антычных аўтарытэтаў – у 1575 г. у Лоску выйшаў твор Цыцэрона «Пра абавязкі людзей усіх станаў» у польскамоўным перакладзе былога бібліятэкара караля Жыгімонта II Аўгуста С. Кашуцкага. Дадзеная кніга атрымала шырокую папулярнасць, аб чым сведчаць яе перавыданні ў Вільні Я. Карцанам у 1583, 1593 і 1606 гг. Акрамя іншага гаворка ў дадзенай кнізе ішла аб неабходнасці самаадданай працы на карысць дзяржавы. Прычым аўтар сцвярджаў, што паўсядзённая праца для грамадства не менш пачэсна, чым вайсковая доблесць, – ён пісаў, што перамога Фемістокла пад Саламінам мела толькі аднаразовы станоўчы вынік, а законамі Салона карысталіся рэгулярна. Поруч з палітыкай, правазнаўствам і мастацтвам таксама тут усхвалялася і стваральная праца рамеснікаў, будаўнікоў, урачоў і настаўнікаў, здольных аказаць дабратворнае ўздзеянне на ўмацаванне краіны. Пры гэтым на задачах апошніх Цыцэрон спыніўся асобна, лічачы іх галоўным абавязкам падрыхтоўку сумленных грамадзян – не толькі асабіста ў школах, але і пасля смерці праз уласныя творы [18, с. 39–40, 79–82].

Аб тым жа наколькі глыбока падобнымі разважаннямі быў прасякнуты светапогляд асобных прадстаўнікоў антытрынітарскага веравызнання, сведчыць іх актыўны ўдзел у грамадскім жыцці. За мужнасць, праяўленую ў час войнаў з туркамі, а таксама ў сражэнні пры Бычыне ў Шлёнску з аўстрыйцамі (1588) іх нават сталі называць «Стоікамі». Уславіў жа супрацьстаянне Рэчы Паспалітай і Асманскай імперыі ў славутай паэме «Хоцімская вайна», прысвечанай гераічным падзеям 1621 г., адзін з вядомых польскіх літаратараў эпохі барока, выхадзец з антытрынітарскай сям'і В. Патоцкі, які сам, дарэчы, мужна выяваў з казакамі ў сярэдзіне XVII ст. [19, с. 94–95].

Можна з гэтай нагоды прывесці і адно патрыятычнае па змесце выслоўе з адзначаных «Сентэнцый» Я. Л. Намыслоўскага:

*Кожны, хто сумленны, палымее такою любоўю да айчыны,*
*Што бязбройны гатовы кінуцца ў полымя кастра.*
*Да ніваў родных такая вялікая любоў усіх людзей прываблівае,*
*Што здаецца, нават, смерць лягчэй была б там [20, с. 114].*

У антытрынітарскім асяроддзі прадстаўніцы слабага полу (асабліва высакародныя) былі куды больш актыўныя ў грамадскім і царкоўным жыцці, чым у кальвіністаў ці лютаран, – некаторыя нават казалі пропаведзі ў час службаў. Для належнага іх выхавання было выдадзена некалькі прац – найперш неабходна назваць твор М. Чаховіца «Люстэрачка паненак хрысціянскіх» (1582). Ён вызначаў шляхі дасягнення ўзорнага вобраза набожнай прадстаўніцы пратэстанцкай сям'і – паслухмянай, працавітай і здольнай адстойваць уласныя рэлігійныя перакананні нават у форме дыспутаў з іншаверцамі. Дзеля апошняга большая частка кнігі прысвячалася аналізу тэкстаў Св. Пісання і крытыцы каталіцкай царквы. У цэлым жа ў гэтай кнізе яе аўтар паслядоўна раскрыў абавязкі добрай арыянкі да Бога, бацькоў, а таксама да іншых людзей «прававерных і няверных» [21, с. 7–9, 87–109].

Якасна дапоўніў М. Чаховіца іншы вядомы арыянскі дзеяч Э. Атвіноўскі, які да ўласнай вершаванай працы «Справы альбо гісторыі адметных нявест» далучыў уласныя разважанні пад назвай «Апісанне набожнай і самавітай жонкі ды добрай гаспадыні» (1589). Галоўным для жанчыны тут абвяшчаліся яе абавязкі: паслухмянай жонкі, клапатлівай маці, разважлівай эканомкі і ветлівай гаспадыні ў дачыненні да гасцей. Яна павінна была быць набожнай, шчодрай у адносінах да збяднелых, цярплівай у вядзенні хатняй гаспадаркі. Сярод біблейскіх персанажаў узорамі для пераймання аўтар абвяшчаў Сусанну і Юдыфь – прыклады этычнай чысціні і стойкасці характару. Постаць першай з іх з'яўлялася важнай у паводзінах замужніх жанчын – несправядліва абвінавачаная, яна здолела праз уласную дабрачыннасць даказаць сваю вернасць супругу. У сваю чаргу другая гераіня здолела спакусіць, а затым і забіць вавілонскага палкаводца Алаферна і такім чынам вызваліць свой родны горад ад непрыяцеля. Узгадваў Э. Атвіноўскі і англійскіх пратэстантак-мучаніц, якія пакутвалі за веру, – А. Эскью (спалена ў 1546 г. за «ерась») і Д. Грэй («Каралева дзевяці дзён», звергнутая

і пакараная смерцю каралевай Марыяй І Цюдор у 1554 г.) [22, с. 14–15, 30–32].

*Заключэнне.* На жаль, лёс антытрынітарыяў у Рэчы Паспалітай аказаўся не зайздросным. Іх нежаданне ісці на кампраміс з іншымі канфесіямі, радыкалізм поглядаў і адначасова з гэтым павелічэнне колькасці прыхільнікаў з розных колаў айчыннага грамадства спрыяла ўзрастанню незадавальнення імі ў асяроддзі правячай эліты Рэчы Паспалітай. У выніку рашэннямі сеймаў 1658, 1659 і 1661 гг. дзейнасць антрынітарыяў у краіне забаранялася, жадаючыя застацца на Радзіме павінны былі перайсці ў каталіцызм, у адваротным выпадку ім пагражала смяротнае пакаранне. Як вынік, большасць прадстаўнікоў дадзенага веравызнання былі вымушаны эмігрыраваць (пераважна ў Прусію, Галандыю і Трансільванію), а іх школы былі разрабаваны і зачынены [23, с. 238–239, 272, 323].

Нягледзячы на гэта, створаная антытрынітарыямі педагагічная мадэль пакінула адметны след у гісторыі айчыннай адукацыі – менавіта яны ў значнай ступені ўспрынялі асноўныя ідэі гуманістычнага светапогляду і ў вучэбна-выхаваўчым працэсе кіраваліся патрэбамі дзяржавы і грамадства, што знайшло сваю праяву ва ўключэнні ў лік прадметаў гісторыі і права, дэмакратызме ў справе набору навучэнцаў, павазе да нацыянальных моў, прывіцці вучнёўскай моладзі пачуцця грамадзянскай адказнасці.

*Літаратура*


1. *Бэрд, Ч.* Реформация XVI века в ее отношении к новому мышлению и знанию / Ч. Бэрд. – СПб. : Изд-во О. Н. Поповой, 1897. – 362 с.
2. *Харлампович, К.* Западнорусския православныя школы XVI и начала XVII века / К. Харлампович. – Казань : Типолитография Имп. Университета, 1898. – 586 с.
3. *Подокшин, С. А.* Реформация и общественная мысль Белоруссии и Литвы. Вторая половина XVI – начало XVII в. / С. А. Подокшин. – Минск : Наука и техника, 1970. – 228 с.
4. *Любович, Н. Н.* Начало католической реакции и упадок Реформации в Польше / Н. Н. Любович. – Варшава : Тип. К. Ковалевского, 1890. – II, 400, VIII с.
5. *Liedke, M.* Od prawosławia do katolicyzmu : ruscy możni i szlachta Wielkiego Księstwa Litewskiego wobec wyznań reformacyjnych / M. Liedke. – Białystok : Wyd. Uniwersyteta w Białymstoku, 2004. – 313 s.
6. *Merczyng, H.* Szymon Budny jako krytyk tekstów biblijnych / H. Merczyng. – Kraków : Akademia Umiejętności, 1913. – X, 178 s.
7. *Андрэева, Е. Г.* Пратэстанцкая адукацыя : этнічны аспект / Е. Г. Андрэева, Л. М. Лыч // Беларускі гістарычны часопіс. – 2004. – № 3. – С. 40–47.
8. *Łukaszewicz, J.* Historya szkół w Koronie i w Wielkim Księstwie Litewskim od najdawniejszych czasów aż do roku 1794 : w 4 t. / J. Łukaszewicz. – Poznań : Wyd-wo W. Deckera i Spólki, 1849–1851. – T. 1. – 1849. – 472 s.
9. *Левицкий, О.* Социнианство в Польше и Юго-Западной Руси / О. Левицкий // Киевская старина. – 1882. – Т. II. – Кн. 4. – С. 25–57.
10. *Kuźmina, D.* Katechizmy w Rzeczypospolitej XVI i początku XVII wieku / D. Kuźmina. – Warszawa : Wyd-wo SBP, 2002. – 185 s.
11. *Харлампович, К.* Западнорусския православныя школы XVI и начала XVII века / К. Харлампович.
12. Estreicher, K. Bibliografia polska : w 3 cz. / K. Estreicher. – Kraków : Druk. Uniwersytetu Jagiellońskiego, 1870–1939. – Cz. 3. – T. 21. – 1938. – 500, III s.
13. *Stegmani, J.* Institutionum Mathematicarum Libri II. Qvibus initia I. Arithmeticae, II. Geometriae, pro incipientibus dilucidè explicantur, & ad praxin variè accommodantur : Jussu Superiorum In usum Scholae Racovianae conscripti : in 2 vol. / J. Stegmani. – Raków : Typis S. Sternacii, 1630. – Vol. 1 : Arithmeticae. – 64 s. ; Vol. 2 : Geometriae. – 212 s.
14. *Падалінская, А. А.* Выкарыстанне ідэй антычнай філасофіі прадстаўнікамі праваслаўнага, каталіцкага і рэфармацыйнага напрамкаў у другой палове XVI – першай палове XVII ст. у Беларусі / А. А. Падалінская // Гісторыя філасофскай і грамадска-палітычнай думкі Беларусі : у 6 т. – Мінск : Бел. навука, 2008. – Т. 3 : Рэфармацыя. Контррэфармацыя. Барока / пад рэд. В. Б. Евароўскага [і інш.]. – 2013. – С. 170–196.


*References*


1. *Berd, Ch.* Reformatsiya XVI veka v yeyo otnoshenii k novomu myshleniyu i znaniyu / Ch. Berd. – SPb. : Izd-vo O. N. Popovoy, 1897. – 362 s.
2. *Kharlampovich, K.* Zapadnorusskiya pravoslavnyya shkoly XVI i nachala XVII veka / K. Kharlampovich. – Kazan : Tipolitografiya Imp. Universiteta, 1898. – 589 s.
3. *Podokshin, S. A.* Reformatsiya i obshchestvennaya mysl Belorussii i Litvy. Vtoraya polovina XVI – nachalo XVII v. / S. A. POdokshin. – Minsk : Nauka i tekhnika, 1970. – 228 s.
4. *Lyubovich, N. N.* Nachalo katolicheskoy reaktsii i upadok Reformatsii v Polshe / N. N. Lyubovich. – Varshava : Tip. K. Kovalevskogo, 1890. – II, 400, VIII s.
5. *Liedke, M.* Od prawosławia do katolicyzmu : ruscy możni i szlachta Wielkiego Księstwa Litewskiego wobec wyznań reformacyjnych / M. Liedke. – Białystok : Wyd. Uniwersyteta w Białymstoku, 2004. – 313 s.
6. *Merczyng, H.* Szymon Budny jako krytyk tekstów biblijnych / H. Merczyng. – Kraków : Akademia Umiejętności, 1913. – X, 178 s.
7. *AkAndreyeva, Ye. G.* Pratestantskaya adukatsyya : etnichny aspekt / Ye. G. Andreyeva, L. M. Lych // Belaruski gistarychny chasopis. – 2004. – № 3. – S. 40–47.
8. *Łukaszewicz, J.* Historya szkół w Koronie i w Wielkim Księstwie Litewskim od najdawniejszych czasów aż do roku 1794 : w 4 t. / J. Łukaszewicz. – Poznań : Wyd-wo W. Deckera i Spólki, 1849–1851. – T. 1. – 1849. – 472 s.
9. *Levitskiy, O.* Sotsinianstvo v Polshe i Yugo-Zapadnoy Rusi / O. Levitskiy // Kiyevskaya starina. – 1882. – T. II. – Kn. 4. – S. 25–57.
10. *Kuźmina, D.* Katechizmy w Rzeczypospolitej XVI i początku XVII wieku / D. Kuźmina. – Warszawa : Wyd-wo SBP, 2002. – 185 s.
11. *Kharlampovich, K.* Zapadnorusskiya pravoslavnyya shkoly XVI i nachala XVII veka / K. Kharlampovich.
12. *Estreicher, K.* Bibliografia polska : w 3 cz. / K. Estreicher. – Kraków : Druk. Uniwersytetu Jagiellońskiego, 1870–1939. – Cz. 3. – T. 21. – 1938. – 500, III s.
13. *Stegmani, J.* Institutionum Mathematicarum Libri II. Qvibus initia I. Arithmeticae, II. Geometriae, pro incipientibus dilucidè explicantur, & ad praxin variè accommodantur : Jussu Superiorum In usum Scholae Racovianae conscripti : in 2 vol. / J. Stegmani. – Raków : Typis S. Sternacii, 1630. – Vol. 1 : Arithmeticae. – 64 s. ; Vol. 2 : Geometriae. – 212 s.
14. *Padalinskaya, A. A.* Vykarystanne idey antychnay ilasofii pradstaunikami pravaslaunaga, katalitskaga i refarmatsyynaga napramkau u drugoy palove XVI – pershay palove XVII st. u Belarusi / A. A. Padalinskaya // Gistoryya filasofskay i gramadska-palitychnay dumki Belarusi : u 6 t. – Minsk : Bel. navuka, 2008. – T. 3. : Refarmatsyya. Kontrrefarmatsyya. Baroka / pad red. V. B. Yevarouskaga [i insh.]. – 2013. – S. 170–196.

15. *Болбас, В. С.* Дабрачыннасцей сад. Маральна-выхаваўчыя ідэі аўтара першага айчыннага падручніка па этыцы Яна Ліцынія Намыслоўскага / В. С. Болбас // Адукацыя і выхаванне. – 1996. – № 9. – С. 40–47.
16. *Саверчанка, І. В.* Сымон Будны – гуманіст і рэфарматар / І. В. Саверчанка. – Мінск : Універсітэцкае, 1993. – 223 с.
17. Прадмовы і пасляслоўі паслядоўнікаў Францыска Скарыны / уклад. У. Г. Кароткі. – Мінск : Навука і тэхніка, 1991. – 308 с.
18. Marka Tulliusa Cicerona O powinnościach wszech stanow ludzi Księgi troie przez Stanisława Kosztutskiego przełozone y krotkiemi przypiskami obiaśnione. K temu przydano żywot iego krotko zebrany z roznych Historykow. A naostatku przydane są przypiski dostateczne ktore poznaczone są tekście liczbą wedle porządku swego. – Wilno : Druk. J. Karcana, 1593. – XXXV, 238 s.
19. *Chodynicki, K.* Reformacja w Polsce / K. Chodynicki. – Warszawa : Polska Składnica Pomocy Szkolnych, 1921. – 101 s.
20. *Лыч, Л.* Пратэстанцкая царква ў нацыянальна-культурным жыцці Беларусі: традыцыі і сучаснасць / Л. Лыч // Штогоднік Інстытута гісторыі НАН Беларусі. – Год першы. – Мінск, 1999. – С. 110–123.
21. *Czechowic, M.* Zwierciadłko panienek chrystiańskich ku obejźrzeniu się w powinnościach swych chrystiańskich / M. Czechowic. – Raków : Druk. T. Adamowicza, 1582. – X, 109 s.
22. *Otwinowski, E.* Sprawy abo Historye znacznych niewiast ze wszytkiego prawie pisma świętego dla pamięci krótko zebrane. Przydane są niektóre rzeczy do tegoż należące. O dobrej żenie. O wychowaniu dziatek. O stroiach y o tańcach / E. Otwinowski. – Kraków : Druk. A. Rodeckogo, 1589. – 61 s.
23. Volumina legum : w 8 t. – Peterburg : Nakl. i druk. J. Ohryzko, 1859–1860. – T. 4. – 1860. – XVII, 501 s.

15. *Bolbas, V. S.* Dabrachynnastsey sad. Maralna-vykhavauchyya idei autara pershaga aychynnaga padruchnika pa etytsy Yana Litsyniya Namyslouskaga / V. S. Bolbas // Adukatsyya i vykhavanne. – 1996. – № 9. – S. 40–47.
16. *Saverchanka, I. V.* Symon Budny – gumanist i refarmatar / I. V. Saverchanka. – Minsk : Universitetskaye, 1993. – 223 s.
17. Pradmovy i paslyasloui paslyadounikau Frantsyska Skaryny / uklad. U. G. Karotki. – Minsk : Navuka i tekhnika, 1991. – 308 s.
18. Marka Tulliusa Cicerona O powinnościach wszech stanow ludzi Księgi troie przez Stanisława Kosztutskiego przełozone y krotkiemi przypiskami obiaśnione. K temu przydano żywot iego krotko zebrany z roznych Historykow. A naostatku przydane są przypiski dostateczne ktore poznaczone są tekście liczbą wedle porządku swego. – Wilno : Druk. J. Karcana, 1593. – XXXV, 238 s.
19. *Chodynicki, K.* Reformacja w Polsce / K. Chodynicki. – Warszawa : Polska Składnica Pomocy Szkolnych, 1921. – 101 s.
20. *Lych, L.* Pratestantskaya tsarkva u natsyyanalna-kulturnym zhyttsi Belarusi: tradytsyi i suchasnasts / L. Lych // Shtogodnik Instytuta gistoryi NAN Belarusi. – God pershy. – Minsk, 1999. – S. 110–123.
21. *Czechowic, M.* Zwierciadłko panienek chrystiańskich ku obejźrzeniu się w powinnościach swych chrystiańskich / M. Czechowic. – Raków : Druk. T. Adamowicza, 1582. – X, 109 s.
22. *Otwinowski, E.* Sprawy abo Historye znacznych niewiast ze wszytkiego prawie pisma świętego dla pamięci krótko zebrane. Przydane są niektóre rzeczy do tegoż należące. O dobrej żenie. O wychowaniu dziatek. O stroiach y o tańcach / E. Otwinowski. – Kraków : Druk. A. Rodeckogo, 1589. – 61 s.
23. Volumina legum : w 8 t. – Peterburg : Nakl. i druk. J. Ohryzko, 1859–1860. – T. 4. – 1860. – XVII, 501 s.